Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур
Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь
Беларускі універсітэт культуры
Беларускі педагагічны універсітэт
Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў
Міжнародная асацыяцыя беларусістаў
Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"
Сусветны кангрэс татараў
Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне Рэспублікі Беларусь
Беларускае згуртаванне татараў-мусульман "Аль-Кітаб"

# ДРУГАЯ МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ "ІСЛАМСКАЯ КУЛЬТУРА ТАТАРАЎ-МУСУЛЬМАН БЕЛАРУСІ, ЛІТВЫ І ПОЛЬШЧЫ І ЯЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ З БЕЛАРУСКАЙ І ІНШЫМІ КУЛЬТУРАМІ"

*Да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім*

Менск, 19-20 траўня 1995 г.

Ч.2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Навуковае выданне

Ісламская культура татар-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі

Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі

апісана у друк 28.II.1996 г. Фармат 60 х 84 I 16.
ера друк. № 2. Афсетны друк. Ум.друк.арк. 9,4 Ум.фарб.-адб.12,2
-выд.арк. 8,3. Тыраж 300 экз. Заказ 1050. Цана 42000.

эпрынт БДПУ, 220809, Мінск, вул.Савецкая, 18

союза цыган прекратилась работа по созданию союза в Белоруссии. Закрылся он 15 февраля 1928 года [13].

Белорусский народ всегда по-доброму относился к цыганам, уважал их трудолюбие, мудрость, национальную гордость. Разумеется, что в небольшой статье невозможно дать всестороннее представление о цыганах, их национальном характере, тем более, что изучение многих материалов, связанных с этим вопросом, пока по-настоящему не началось. Поэтому в основе сделанной автором пробы – обобщения, основанные на фактическом материале, и рассуждения, которые могут и должны быть дополнены, в чем-то конкретизированы и оспорены.

ЛИТЕРАТУРА:

1. Даўгяла Т.І. Цыганы на Беларусі. – Наш край, Мн., 1926.

2. Друц Е., Гесслер А. Цыгане. – М.: "Сов. писатель", 1990.

Маліоскі М. Вечныя вандроўнікі. – Чырвоная змена, 1994, 20 кастрычніка.

Лещенко В. Отблеск угасших костров, или некоторые тайны цыганской жизни. – Народная газета, 1994, 12/14 марта.

3. Даўгяла Т.І. Цыганы на Беларусі. – Наш край, Мн., 1926, с. 28.

4. Там же, с. 28.

5. Там же, с. 29.

6. Жучкевич В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Изд. БГУ им. Ленина, 1974, с. 389.

7. Даўгяла Т.І. Цыганы на Беларусі. – Наш край, Мн., 1926, с. 25.

8. Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Мн., Полымя, 1992, с. 87.

9. Даўгяла Т.І. Цыганы на Беларусі. – Наш край, Мн., 1926, с. 25.

10. Этнография Беларуси. с. 522.

11. Национальный архив Республики Беларусь /далее НАРБ/. – Ф. 701, 0.1, д. 13, л. 56.

12. Этнография Беларуси. с. 523.

13. НАРБ. – Ф. 701, 0.1, д. 13, л. 56.



А. Рацько

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД НАСЕЛЬНІЦТВА ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПЕРШАГА УСЕРАСЕЙСКАГА ПЕРАПІСУ 1897 ГОДА

Этнічная прыналежнасць насельніцтва гарадоў Беларусі ў канцы XIX ст. мае важнае значэнне для вывучэння сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця нашых зямель: а таксама фарміравання беларускай нацыі.

Упершыню статыстычныя дадзеныя па этнічнаму складу насельніцтва Расійскай Імперыі былі атрыманы падчас першага навукова арганізаванага перапісу 25 студзеня 1897 г. Неабходна адзначыць, што вызначэнне этнічнай прыналежнасці ў шматнацыянальнай дзяржаве – справа складаная. Пры правядзенні перапісу не ставілася пытанне аб этнічнай прыналежнасці. Ва ўмовах царскай Расіі, калі большая частка насельніцтва (у тым ліку і гарадоў) была непісьмовай, прымяненне прамога пытання аб этнічнай прыналежнасці наўрад ці дало б аб'ектыўныя вынікі. Вопыт іншых краін паказваў, што значная доля насельніцтва замест этнічнай указвала племянную, рэлігійную, саслоўную ці іншую прыналежнасць. Возьмем для прыкладу рэлігійную прыналежнасць. Большасць жыхароў Заходніх губерняў адносіліся да праваслаўных, католікаў і іудзеяў (яўрэяў). Пры гэтым абсалютную большасць праваслаўнага насельніцтва складалі беларусы, у нейкай ступені – рускія і ўкраінцы, каталіцкага – беларусы, а таксама палякі, літоўцы, татары. У іудзеяў і ў пэўным сэнсе ў татар вераспавядальны прызнак супадаў з нацыянальным.

Такім чынам, пытанне аб вераспавяданні ў спалучэнні з пытаннем аб роднай мове давала магчымасць з высокай ступенню дакладнасці вызначыць этнічны склад насельніцтва.

К канцу XIX ст. на тэрыторыі Заходніх губерняў налічвалася 39 уездных гарадоў (уключаючы губернскія), 5 так званых заштатных (раней быўшых уезднымі) гарадоў і 358 мястэчак [1] – дробных пасяленняў, не меўшых статуса гарадоў. Насельніцтва мястэчак часткова займалася гандлева-прамысловай дзейнасцю, часткова сельскай гаспадаркай. Развіцце прамысловасці і чыгуначнага транспарту паскорыла рост гарадскога насельніцтва, якое з 1863 г. па 1897 г. павялічылася на Беларусі з 330 тыс. да 648 тыс. [2]. Сярод найбуйнейшых па колькасці жыхароў гарадоў Беларусі адзначым: Мінск (90,9 тыс.), Віцебск (65,9тыс.), Гродна (46,9



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тыс.), Брэст (46,6 тыс.), Магілеў (43,1 тыс.), Гомель (36,8 тыс.), Бабруйск (34,3 тыс.), Пінск (28,4 тыс.) [3].

Як сведчаць матэрыялы перапісу 1897 г., гарадское насельніцтва пяці заходніх губерняў было надзвычай разнастайным у нацыянальна-рэлігійных адносінах. Калі параўноўваць сітуацыю сярэдзіны XIX ст. і часу правядзення перапісу, то можна заўважыць шэраг змяненняў у этнічнай сітуацыі гарадоў Беларусі. У 1866 г. у гарадах праваслаўных было 28,1%, католікаў – 20,1%. Амаль палову гарадскога насельніцтва (47,7%) складалі іудзеі. Колькасць яўрэйскага насельніцтва ў гарадах вагалася ад 43% у Віленскай да 50,3% у Гродзенскай і Магілеўскай губернiях. У 1897 г. удзельная вага праваслаўнага насельніцтва ў гарадах памяншаецца да 26,7%, католікаў – 16%. Колькасць яўрэйскага насельніцтва ўзрасла да 53,9% [4].

А вось як выглядае ў працэнтных адносінах нацыянальны склад гарадскога насельніцтва 5-ці заходніх губерняў па роднай мове [5].

| Гарады губерняў | Беларусы | Рускія | Палякі | Яўрэі | Іншыя |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленскай | 7,6 | 18,3 | 26,6 | 43,0 | 4,5 |
| Віцебскай | 13,3 | 22,1 | 8,1 | 52,0 | 4,5 |
| Гродзенскай | 9,6 | 15,8 | 13,3 | 61,2 | 0,1 |
| Мінскай | 11,8 | 19,5 | 7,2 | 58,8 | 2,7 |
| Магілёўскай | 30,0 | 13,0 | 2,9 | 52,4 | 1,7 |
| У сярэднім | 14,5 | 17,7 | 11,6 | 53,5 | 2,7 |

Як бачым: абсалютную большасць насельніцтва гарадоў Беларусі ў канцы XIX ст. складалі яўрэі (53,5%), у той час як беларускае насельніцтва ў сярэднім складала 14,5% (рускае – 17,7%, польскае – 11,6%). Такая сітуацыя тлумачыцца перш за ўсе палітыкай царскага ўрада, а таксама эканамічнай сітуацыяй у Беларусі ў канцы XIX ст.

Колькасная перавага яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках Беларусі склалася ў выніку ўвядзення царскім урадам "мяжы аседласці", паводле якой яўрэям дазвалялася сяліцца толькі ў заходніх губернiях Расіі, у тым ліку беларускіх. Па закону 3 мая 1882 г. яўрэям забаранялася ў раёне аседласці жыць за межамі гарадоў і мястэчак. У пачатку



90-х гг. на Беларусь была выслана значная колькасць яўрэяў з Масквы і іншых гарадоў цэнтральнай Расіі. Такім чынам была створана штучная перанаселенасць гарадоў Беларусі. Лішак працаздольнага яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках 5-ці заходніх губерніяў у пачатку 90-х гадоў пераважаў 470 тыс. і быў значна большы, чым усё насельніцтва Мінска, Віцебска, Гродна, Пінска, Гомеля, Бабруйска і Магілева [6].

Як вядома, у паслярэформеннае 40-годдзе фабрычна-завадская вытворчасць размяшчалася пераважна па-за межамі буйных гарадоў. Галоўнай прычынай таму была спецыялізацыя беларускай прамысловасці па апрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны, якая прывязывала яе да сельскай мясцовасці. Сельская мясцовасць была прывабная для капіталістаў яшчэ і меншай арэнднай платай за зямельныя ўчасткі, больш таннай рабочай сілай. А гарады заставаліся пераважна гандлёва-адміністрацыйнымі, чым прамысловымі асяродкамі. Яны ўраджвалі шматлікасцю лавак і крамак. Ледзь не на кожным кроку можна было купіць селядцоў, тытуню, хустку і г. д. [7]. Менавіта яўрэйскае насельніцтва традыцыйна займалася гандлёва-прамысловай дзейнасцю ў гарадах. Скучанасць тут яўрэяў стрымлівала прыток сюды збяднелага беларускага сялянства. Колькасць выхадцаў з вёскі сярод гараджан 5-ці заходніх губерніяў у 1897 г. складала 43,1 тыс. чалавек [8].

Рускае насельніцтва па колькасці займала другое месца пасля яўрэйскага – 17,7%. Гэта тлумачыцца перш за ўсе палітыкай русіфікацыі, якую праводзілі ўлады. Ураджэнцы Расіі запаўнялі адміністрацыю, школу, царкву. Беларусам настойліва ўбівалася ў галаву, што яны – рускія, толькі "сапсаваныя" польска–каталіцкім уплывам. Выкарыстанне беларускай мовы не дапускалася ні ў школе, ні ў дзяржаўных установах, ні ў друку. Вельмі шмат рускіх прыйшло ў гарады Беларусі разам з рускай Імперскай арміяй. Сярод тых, хто прадстаўляў у краі ўладу і права (адміністрацыя, суд, паліцыя, грамадскія і саслоўныя службы), па перапісу 1897 г. рускія складалі 42,0% (беларусы – 30,7%, палякі – 12,0%) [9].

Значнай колькасцю насельніцтва гарадоў Беларусі на рубяжы XIX–XX ст. былі палякі (11,6%). Галоўнай сацыяльнай асаблівасцю мясцовага польскамоўнага насельніцтва з'яўлялася надзвычай высокая ўдзельная вага ў ім патомнай шляхты. Па перапісу 1897 г. амаль кожны другі патомны дваранін Беларусі вызначыў сваю нацыянальнасць як польскую.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Акрамя згаданых (беларусы, украінцы, яўрэі, палякі), у гарадах Беларусі пражывалі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў – латышы, літоўцы, татары. На іх долю прыпадала ў сярэднім 2,7% гарадскога насельніцтва. Асаблівую цікавасць для нас уяўляюць татары, якія пасяліліся на тэрыторыі беларускіх зямель яшчэ ў часы Вітаўта.

Як вядома, царскі ўрад лічыў татараў-мусульман сваімі патэнцыяльнымі прыхільнікамі ў барацьбе з мясцовым нацыянальна-вызваленчым рухам. Таму, у адрозненне ад каталіцкай шляхты, татар ахвотней прымалі на ваенную і грамадзянскую службу. Нават выхадцы з дробнага дваранства мелі перспектыву росту па службе. У канцы XIX ст. сотні татар мелі афіцэрскія і нават генеральскія званні. У гарадах Беларусі было шмат татарскага чыноўніцтва. Традыцыйна татары служылі на пошце, у паліцыі, судовым ведамстве, фінансавых органах, нямала сярод іх было землямераў, акцызных чыноўнікаў у казенным вінным ведамстве (як і ў многіх іншых месцах, татар вельмі цанілі за цвярозасць) [10].

Аналізуючы статыстычныя дадзеныя аб менскіх татарах паводле перапісу 1897 года, Л.Цвяткоў піша, што апроч вайскоўцаў, якія складваюць найбольшую колькасць – 122 чал., звяртаюць на сябе ўвагу 72 мужчыны і 22 жанчыны, што знаходзяцца на службе ў прыватных асоб. Далей ідзе вялікая група, якая займаецца земляробствам – 59 мужчын і 10 жанчын. У адміністрацыі, судзе, паліцыі служыла 28 чалавек. Затым мы бачым пэўную колькасць татараў, што працуюць на чыгунцы (16 чал.), возьнікамі фурманак (5 чал.), служачых на пошце, тэлеграфе, тэлефоне (5 чал.), гандляроў прадметамі хатняга ужытку (5 чал.) і г.д. [11].

Як бачым, татарскае насельніцтва Менска ў канцы XIX ст. складалася ў асноўным з людзей вайсковай і вытворчай працы, з чыноўнікаў і служачых. Непрацоўных было вельмі мала. Гэта было характэрна і для іншых гарадоў Беларусі. Неабходна адзначыць, што сярод татар быў высокі працэнт пісьменных, адукаваных людзей. Татары, нягледзячы на безупынныя зносіны з беларусамі, захавалі сваю веру і культуру, аказаўшы тым самым пэўны станоўчы ўплыў на беларусаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Белоруссия в эпоху капитализма. Т.2. –Мн., 1990. –С.5.
2. Гісторыя Беларускай ССР. Т. 2. – Мн., 1972. –С. 126.
3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2–х ч. –Мн., 1994. –С.318



4. Белоруссия в эпоху капитализма. Т. 2. –С. 6.
5. Біч М. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту у Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Весці АН БССР, М4, 1972. –С.33.
6. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. – С.335.
7. Шыбека З. Гісторыя Беларусі ў XIX – XX стагоддзях (раздзелы з ненадрукаванай кнігі). // Голас Радзімы. № 39. 29 верас. 1994. – С.5.
8. Біч М. В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту... – С. 39.
9. Смалянчук А. Ф. Колькасць і нацыянальная структура польскага насельніцтва на Беларусі і ў Літве ў канцы XIX пачатку XX ст. // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Тэзісы дакладаў і паведамленняў. Ч. 1. – С. 131.
10. Думін С.У., Канапацкі І. Б. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. – Мн., 1993. – С. 132, 134.
11. Цвяткоў Л. Некалькі слоў аб менскіх татарах // Наш край, 1927, Хі 6–7.

У. Тугай

## ЛАТЫШСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў 20–30 ГГ. XX СТ.

Жыцце злучала не толькі сем'і, але і народы. Так і наша Беларусь не толькі была радзімай для карэннай нацыі, але прытуліла і сыноў іншых народаў, стала ім роднай. У гэтай сувязі вельмі цікавая і навучальная гісторыя латышскіх перасяленцаў – сялян і гараджан, якія сталі блізкімі людзьмі і добрымі суседзямі для многіх беларусаў, іншых жыхароў шматнацыянальнай Беларусі.

Гісторыяй латышскага перасяленчага руху займалася латышская камісія інстытута беларускай культуры з 1927 года, з 1929 года латышскі сектар АН БССР, з чэрвеня 1933 года латышская секцыя інстытута нацменшасцей АН БССР.

Нягледзячы на тое, што ў дзейнасці вучоных было нямала станоўчага, што быў сабраны цікавы фактычны матэрыял, праблема латышскіх перасяленцаў застаецца маладаследаванай і патрабуе больш глыбокага вывучэння.

У пачатку 20-х гадоў на Беларусі пражывала больш за 14 тысяч латышоў (у Віцебскай акрузе – 6,8 тыс. чалавек, Полацкай – 2 тыс., Магілеўскай – больш 1,8 тыс. чалавек). [1].

У раёнах кампактнага пражывання латышоў у 20–30-я гады былі створаны латышскія сельскія саветы. Большая частка



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ